Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 22 (300) | СУБОТА 28 верасня 1957 г. | Цана 20 кап.

ДАСЛЕДУЮЦЬ БУДУЧЫЯ БІЁЛАГІ

У чацвераку рснікаў біялагічнага факультэта ідуць практычныя заняткі па фізіялогіі жывёл.

НА ЗДЫМКУ: Люба Панцелеева і Ніна Кошкіна у лабараторыі кафедры дарвінізма і фізіялогіі чалавека праводзяць даследаванні.

У гонар свята

На хімічным факультэце распрацаван план мерапрыемстваў у гонар Вялікага Кастрычніка. Вызначана камісія па падрыхтоўцы да 40-годдзя. Да гэтай знамянальнай даты рыхтуецца выданне юбілейнага зборніка навуковых запісак, у які акрамя артыкулаў па эксперыментальных даследаваннях увойдзе абзорны артыкул «Хімічны факультэт да 40-годдзя Кастрычніка» і бібліяграфія усіх прац, апублікаваных факультэтам за час свайго існавання. Мантыруецца юбілейная выстаука, дзе у выглядзе дыяграм, фота будзе адлюстравана гісторыя факультэта, яго дасягненні, навуковае, вучэбнае, грамадскае жыццё, яго сувязь з вытворчасцю.

Напярэдадні свята будзе праведзена урачыстае паседжанне, спецыяльныя навуковыя сесіі, прысвечаныя Кастрычніку.

Студэнты рыхтуюць даклады

Студэнты біялагічнага факультэта рыхтуюцца да сустрэчы 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі. Многія з іх працуюць над дакладамі, якія будуць прачытаны у юбілейныя дні на студэнцкай навуковай канферэнцыі. Так, студэнтка IV курса Галя Галкоуская рыхтуе даклад на тэму: «Навукова-даследчая праца студэнтаў біёлага-глебавага факультэта універсітэта». Яе аднакурсніца Ліля Ілына распрацоувае пытанні фарміравання фауны водасховіш на рацэ Свіслач.

А. БЕЛОЎ.

Да 40-годдзя Вялікага Кастрычніка

* * *

ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ!

Набліжаецца саракавая гадавіна слаўнага радаснага свята працоўных усіх краін—Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі.

Чалавецтва за час свайго існавання перажыла нямала сацыяльных рэволюцый—іх полымем азараны усе пераломныя эпохі гісторыі. Але ні адна рэволюцыя мінулага не можа параўнацца з Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыяй па сваіх маштабах, па глыбіні ажыццёўленых грамадскіх пераўтварэнняў, па свайму значэнню для гістарычных лёсаў чалавецтва.

Перамога рабочых і сялян Расіі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў начале з В. І. Леніным у кастрычніку 1917 года паклала пачатак новай эры ў гісторыі чалавецтва—эры крушэння капіталізма і зацверджання новага, сацыялістычнага грамадства. Кастрычніцкая рэволюцыя—самая грандыёзная па маштабах, самая глыбокая па сваіх задачах і мэтах. Яна ажыццявіла векавыя надзеі працоўных, паклала канец эксплуатацыі чалавека чалавекам, канец усялякаму сацыяльнаму і нацыянальнаму гнёту. Яна не толькі абвясціла, але і правяла ў жыццё вялікія ідэі сацыялізма, міру, роунапраўя і дружбы народаў.

«Саракагоддзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі,—гаворыцца ў нядауна апублікаваных Тэзісах Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС,—з'яуляецца светлым святам усіх народаў Совецкага Саюза, усіх сацыялістычных краін, усяго міжнароднага рабочага класа, працоуных усяго свету». Усё прагрэсіунае чалавецтва рыхтуецца дастойна сустрэць гэтую знамянальную гадавіну.

У нашай краіне зараз няма такога участка, дзе-б рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя не жылі адзіным імкненнем і жаданнем як мага лепш сустрэць вялікае свята—саракагоддзе улады працоуных. Іх лепшы падарунак саракагоддзю Кастрычніка—новыя дасягненні ва усіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, новыя перамогі на шляху велічнага руху совецкага народа да комунізма.

Актыуная падрыхтоука да знамянальнай гадавіны ідзе і у нашым універсітэце. Вучоныя рыхтуюць юбілейныя выпускі навуковых работ, даклады на юбілейную сесію. Студэнты правядуць навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя 40-годдзю Кастрычніка. Многія выпускнікі гістарычнага факультэта прысвячаюць свае дыпломныя работы вывучэнню перыяда падрыхтоукі і правядзення Кастрычніцкай рэволюцыі. Новыя праграмы выступленняу рыхтуюць да вялікага свята калектывы мастацкай самадзейнасці. Студэнты, якія зараз знаходзяцца на сельскагаспадарчых работах, імкнуцца адзначыць набліжаючыйся юбілей Совецкай улады сумленнай і упартай працай на калгасных палях.

З першага кастрычніка пачнуцца заняткі на усіх курсах. Перад калектывам універсітэта стаіць задача—мабілізаваць свае намаганні на тое, каб з першага кроку чотка арганізаваць вучэбны працэс і новымі вытворчымі поспехамі адзначыць гадавіну Кастрычніка. Наша вытворчасць—вучоба, навуковая праца. Таму усю падрыхтоуку да 40-годдзя Кастрычніка партыйныя і комсамольскія арганізацыі павінны зараз весці ў плане павышэння якасці лекцый і семінарскіх заняткаў, паляпшэння самастойнай працы студэнтаў, умацавання вучэбнай і працоунай дысцыпліны.

Вялікая задача стаіць перад нашымі агітатарамі, перад кафедрамі грамадскіх навук. Яны павінны на усіх курсах, ва усіх групах, сярод адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў, сярод насельніцтва горада арганізаваць глыбокае вывучэнне Тэзісаў Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі».

Неабходна давесці да свядомасці кожнага студэнта, кожнага працоунага багацейшы змест гэтага дакумента, растлумачыць ім вялікае, сусветна-гістарычнае значэнне перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі ў нашай краіне.

Можна не сумнявацца ў тым, што наш калектыў не пашкадуе намаганняў, каб дастойна сустрэць саракагоддзе Кастрычніка.

УНІВЕРСІТЭЦКІЯ БУДНІ

ПРАЦАВАЦЬ ДАВОДЗІЦЦА МНОГА

Большасць студэнтаў хімічнага факультэта паехалі працаваць у сельгасарцелі Мінскага раёна. Але не пустуюць сёння лабараторыі факультэта. Тут заусёды можна сустрэць студэнтаў IV курса.

Мы пабывалі у 34 аудыторыі хімкорпуса, дзе асістэнт Н. Г. Рафальскі праводзіў лабараторныя заняткі. У памяшканні лабараторыі шмат хімічных прыбораў і прыстасаванняу, якімі карыстаюцца студэнты для выканання сваіх работ. Зіна Бадзілоуская і Таня Галаватая уважліва сочаць за тэрмометрам Бэкмана, паказваючым тэмпературу з дакладнасцю да адной тысячнай градуса. Ім трэба самыя дакладныя даныя і тады можна будзе правільна вызначыць малекулярную вагу. Праца складаная, але цікавая. Не менш складанай праца і ў Людмілы Лімантавай. Яна устанауліваe, у якой залежнасці знаходзіцца ціск насычанага пара ад тэмпературы. Уся увага дзяючыны сканцэнтравана на паказчыках манометра. У Насці Сай другая задача. Яна павінна вызначыць электрарухаючую сілу канцэнтрацыйных ланцугоу. Кожная са студэнтак стараецца добра выканаць сваю працу. Нельга-ж працаваць спусціушы рукавы, калі ведаеш, што твае сябры па вучобе паспяхова выконваюць свой працоуны абавязак на палях Мішчыны і далёкага Казахстана.

(Працяг на 4 стар.).



На здымку: Насця Сай за вызначэннем электрарухаючай сілы канцэнтрацыйных ланцугоу.

Вясной гэтага года біёлагі атрымалі выдатны падарунак: пры нашым універсітэце была адкрыта лабараторыя фотасінтэзу. У распараджэнне даследчыкаў прадастаулена навейшае абсталяванне. Вялікую каштоунасць мае новы біёлага-даследчы мікраскоп, які дае павелічэнне у 2 500 разоу. Прымяняецца ён для назіранняу і фатаграфаванняу аб'ектаў. З дапамогай яго можна назіраць прыжыццёвыя змены у арганізме расліны. Чакаецца паступленне у лабараторыю яшчэ больш дасканалых люмінесцэнтных мікраскопаў і абсталявання. Пастаулена задача па скарыстанню у даследчай рабоце радыёактыуных ізатопаў. Выкананне гэтай задачы мае выключнае значэнне для вывучэння перамяшчэння рэчываў па расліне. У гэтай лабараторыі вядзецца вялікая навукова-даследчая праца пад кіраўніцтвам акадэміка Ц. Н. Годнева па вывучэнню зменлівасці фотасінтэзіруючага апарата раслін пад уздзеяннем знешніх фактараў.

Было падмечана, што расліны, якія вырошчваліся на тарфяных глебах, маюць вялікую схільнасць да палёжкі. Розныя думкі выказваліся аб гэтым. Адны лічылі, што асноунай прычынай гэтага быу згіб саломіны расліны, якая быццам-бы не вытрымлівала цяжару налітага коласа. Але, як паказалі даследаванні кафедры фізіялогіі раслін, у асноуным у палёгшых раслін карнявая сістэма аказвалася вывернутай. Тады паустала пытанне: ці у аднолькавай меры развіваецца карнявая сістэма ў злакавых раслін на тарфяных і мінеральных глебах? Даследаванні паказалі, што на тарфяных глебах карнявая сістэма вельмі слабая і уся знаходзіцца у паверхневым слоі. Гэта адна з важных прычын таго, што расліны палягаюць часцей за усё на тарфяных глебах.

У лабараторыі паспяхова вывучаюцца асаблівасці росту лісцяу раслін, пасеяных на сугліністы і тарфяны глебах. Было выяулена, што у раслін, якія растуць на тарфяных глебах, фотасінтэзіруючыя зерні—пластыды зменшаны у размерах. Але калі у глебу унесці угнаенні, змяшчаючыя медзь і марганец, то размеры зерня павялічваюцца. Так устаноулена зменлівасць фотасінтэзіруючага апарата пад уплывам угнаенняу.

Шырока вывучаюцца пластыды на водных раслінах, даследаванне якіх значна прасцей, чым наземных; іх можна разглядаць пад мікраскопам, не разразаючы ліста.

Вынікі гэтай даследчай работы абагульняюцца у навуковай працы дацэнта С. В. Калішэвіча «Уплыу глебавых умоу на фотасінтэзіруючы апарат раслін».

Здан у друк артыкул акадэміка Ц. Н. Годнева і Н. С. Судніка «Аб дынаміцы накаплення хлорафіла А і Б у пладовых раслінах у залежнасці ад светавога рэжыму».

Кафедрай фізіялогіі раслін сумесна з кафедрай беспазванковых

На здымку: дацэнт С. В. Калішэвіч у лабараторыі фотасінтэзу вядзе новыя лабараторныя даследаванні.

Фота О. СЦЕПАНЕНКА.

НОВЫЯ ЛАБАРАТОРНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

глебы на рост парастка і карнявой сістэмы расліны і аб суадносінах паміж імі. Гэтай праблеме прысвечаны навуковы даклад дацэнта С. В. Калішэвіча «Аб суадносінах росту паміж надземнай часткай раслін і карнявой сістэмай на тарфяных і мінеральных глебах». Гэтая значная навукова-даследчая праца, прысвечаная 40-й гадавіне Вялікага Кастрычніка,—вынік карпатлівай даследчай працы, якая праводзілася звыш трох год.

Рад работ аб заключных рэакцыях у біясінтэзе хлорафіла праведзен сумесна работнікамі лабараторыі фотасінтэзу з работнікамі АН БССР.

В. ІСТРОЎ.

Студэнты з ПОЛЬШЧЫ ў Беларускім універсітэце

Па запрашэнню Беларускага таварыства культурнай сувязі з загранiцай і грамадскасці універсітэта 17 верасня у Мінск прыбыла група студэнтаў і выкладчыкаў кафедры беларускай філалогіі Варшаускага універсітэта.

...Цёплая сустрэча. Першыя знаёмствы.

Цікавая размова!

З аутобуса, які накіроуваецца ў гасцініцу, чуваць польскія і беларускія песні. Гэта спяваюць студэнты Варшавы і Мінска.

Ля гасцініцы «Беларусь» з прамовай выступіў кіраунік польскай дэлегацыі, старшыня праулення Беларускага грамадска-культурнага таварыства у Варшаве Георгі Туронак. Ён выказаў задавальненне тым, што група польскіх студэнтаў і выкладчыкаў, якія займаюцца пытаннямі беларускай філалогіі, атрымала магчымасць пабываць у Мінску.

З адказным словам выступіў дэкан філалагічнага факультэта прафесар М. Г. Ларчанка.

18 верасня у БДУ адбыуся вечар, прысвечаны сустрэчы беларускіх і польскіх студэнтаў. М. Г. Ларчанка цёпла вітаў прадстаунікоу братняй Польшчы, пажадаў ім поспехаў у працы, шчасця у асабістым жыцці. Ён расказаў гасцям аб гісторыі нашага універсітэта, аб пастаноуцы навуковай і вучэбнай працы на філалагічным факультэце, аб жыцці і адпачынку студэнтаў.

Ад імя польскай дэлегацыі выступіла асістэнт кафедры беларускай філалогіі Варшаускага універсітэта Лідзія Якубауна Базылюк.

— Наша кафедра створана нядауна, — сказала яна. — Пакуль што у нас займаецца толькі 22 студэнты: 18 на другім і 4 на першым курсе. 25 верасня праводзіцца дадатковы прыём.

Л. Я. Базылюк расказала аб навуковай працы і вучобе на кафедры беларускай філалогіі.

— Вашы студэнты,—сказала яна у заключэнне,—вельмі любяць чытаць вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Таму мы вырашылі падарыць вам збор яго твораў.

Студэнты II курса кафедры беларускай філалогіі Нікалай Кіндзюк і Нікалай Асіпюк пад гучныя апладысменты падносяць да стала прэзідыума падарунак польскай дэлегацыі.

Пасля сходу госці знаёмілися з Беларускім універсітэтам, у наступныя дні—з Мінскам, выязджалі у Новагрудак, на радзіму Адама Міцкевіча, і у Гомель.



Кіраунік польскай дэлегацыі Георгі Туронак дзеліцца ўражаннямі з беларускімі студэнтамі.

М. І. Жыркевіч і В. М. Цімафеева разглядаюць кнігі, падораныя польскімі студэнтамі.

40 ГОД НАЗАД

Ў НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ

(З расказа удзельніка грамадзянскай вайны **П. П. Раманюка**)

У мяне часта просяць расказаць пра тыя далёкія гады, калі мы заваёувалі Совецкую уладу. Прайшло ужо нямала часу, але у маёй памяці па сённяшні дзень застаціся малюнкі мінулага. Цяпер, калі я гляджу на нашу моладзь, перад якой так шырока адкрыты дзверы у навуку, у будучыню, я думаю аб тым, у якой жорсткай барацьбе прышлося заваёуваць перамогу, колькі ахвяр патрэбна было прынесці у імя таго, каб добра жылося тым, хто зараз вучыцца у школах, авалодвае сваёй любімай прафесіяй і спецыяльнасцю у ВНУ, тэхнікумах, на фабрыках і заводах. Я успамінаю і сваё юнацтва. Яно, як і мае дзяцінства, было зусім не падобным на юнацтва маладых грамадзян нашай Радзімы. Ужо з сямі год я дапамагау сваім бацькам, пасвіу чужых кароу, працаваў на сельскай гаспадарцы. Аб вучобе і думаць не прыходзілася.

Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя застала мяне у Саратаве. У гэты час я ляжаў у шпіталі, куды прывезлі мяне, цяжка раненага на адным з фронтаў першай сусветнай вайны. Добра памятаю, як праз некалькі дзён пасля перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі у Саратаве меншавікі арганізавалі мітынг з мэтай настроіць масы супраць большэвікоу. Яны хацелі скрыць ад народа тое, што у Петраградзе перамагла соцыялістычная рэволюцыя і што там установлена Совецкая ўлада. Але у самы апошні момант на мітынгу нечакана з'явіліся больпэвікі. Вестка аб перамозе Вялікага Кастрычніка у Петраградзе, Маскве і іншых гарадах Расіі была радасна сустрэта усімі прысутнымі. У гэты дзень у Саратаве адбылася масавая дэманстрацыя рабочых, якія выразілі сваю салідарнасць Комуністычнай партыі і Совецкай уладзе. Улада Советаў устанавілася і тут.

Вышаўшы са шпіталя, я уступіў у рады Чырвонай Арміі. У Саратаве да гэтага часу з рабочых были арганізаваны два палкі. У адным з іх, які у жніуні 1918 года выступіу на абарону Царыцына ад белаказацкай арміі Краснова, быу і я. На Царыцынскім фронце мне давялося бачыць І. В. Сталіна і М. І. Калініна. Яны прыязджалі на пярэдні край абароны, куды были сцягнуты сілы, падышоушыя на дапамогу з Украіны і Дона. Пры абароне горада былі выкарыстаны усе магчымасці, каб толькі вораг не мог захапіць яго. Насельніцтва капала акопы, і войскі белагвардзейцаў, наступаушыя на Царыцын, сустрэлі моцны адпор абаронцаў горада.

Два разы—спачатку у кастрычніку 1918 года, а затым у лістападзе гэтага-ж года,—Царыцын пападаў у акружэнне і два разы адбіваў атакі ворагаў. Нарэшце, белагвардзейцы былі разбіты і адкінуты.

У 1918 годзе я быу накіраваны разам з другімі таварышамі у горад Камышын на барацьбу супраць дэзерцірства, якое наглядалася у арміі сярод адсталых элементау, падбухтораных ворагамі.

У барацьбе з замежнымі інтэрвентамі прайшлі 1919—1920 гады. Вялікай цаной была здабыта перамога.

Совецкі народ прыступіу да пабудовы новага жыцця.

Зараз, аглядаючыся на пройдзены шлях нашай краіны, успамінаеш тыя гады, калі ішла барацьба за Совецкую уладу. Кроу, пралітая народам у грамадзянскую вайну, не прапала дарэмна. Сёння усе мы разам ганарымся нашай магутнай любімай Радзімай!

В. ІВАНОЎСКІ.

ВЕРАСЕНЬ 1917 года

У другой палове верасня у Мінску бурна праходзілі масавыя сходы па абмеркаванню большэвіцкага «Праекта наказа дэпутату у Совет». На гэтых-жа сходах рабілі справаздачы дэпутаты Совета, абраныя у маі месяцы, праходзілі выбары новых дэпутатаў. Сходы прадстаулялі свайго рода суд над дэпутатамі, якія, згодна статуту Совета, павінны были рабіць справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі. Бундаўцы, меншавікі і эсэры выганялися з Совета, як не апраудаушыя ускладзенага на іх давер'я рабочых і салдат.

22 верасня адбыуся справаздачны сход Мінскага Совета. З усіх сходаў Совета, якія праходзілі да гэтага, ён быў бадай самым шматлюдным і бурным. Выступаць у спрэчках запісалася вялікая колькасць рабочых і салдат.

Салдат Целятнікаў, які выступіў на сходзе, настойліва патрабаваў ад Совета забраць уладу ў горадзе ў свае рукі. «Совет праводзіць недастаткова рашучую тактыку, —заявіў ён.—Настрой мас баявы...Совет павінен дзейнічаць рэволюцыйна... Трэба захапіць уладу ў горадзе».

Пачаўшыеся 17 верасня выбары ў Совет сведчылі, што рабочыя і салдаты паўсюдна, выганяючы са старога складу Совета згоднікаў, выбіраюць дэпутатамі большэвікоу. Гэта не магло не спалохаць ворагаў рэволюцыі. Каб некалькі заспакоіць буржуазныя слаі горада, яны пачалі выказваць спрыяльныя для сябе прагнозы выбараў. Газета «Новое Варшавское утро» прадказвала, напрыклад, што ў Совет большэвікоў будзе абрана зусім мала. Калі-ж у канцы верасня большэвікі Мінска апублікавалі папярэднія вынікі перавыбараў, з якіх было відаць, што большэвікі ў Совеце атрымалі яўную перавагу, тая-ж газета вымушана была горка ўздыхнуць і заявіць: «Выбары ідуць даволі вяла. Да сяго часу на выбарах перавага на баку большэвікоў».

Наіўнай была спроба буржуазных пісак растлумачыць перамогу большэвікоў «вяласцю выбараў». Але яны ішлі на гэтую яўную хлусню, не жадаючы публічна прызнацца ў сваім канчатковым паражэнні.

Выбары у Совет закончылися 6 кастрычніка. Масы беспаваротна адвярнуліся ад згоднікаў. Усяго у Совет было абрана 337 дэпутатаў, з іх: большэвікоў—184, эсэраў—60, меншавікоў—21, бундаўцаў—21, беспартыйных, якія ў асноўным падтрымлівалі большэвікоў,—48, сіяністаў—3.

Большэвіцкая фракцыя ва ўноў абраным Совеце забяспечыла за сабой выключную большасць і ў Выканаучым Камітэце. Там большэвікі атрымалі 23 месцы, эсэры—7, бундаўцы—4, меншавікі —2.

Новы склад Совета ўсю працу накіраваў выключна на падрыхтоўку сіл да ўзброенага паустання. Падрыхтоўку ўзброенага паўстання у Мінску большэвікі спалучалі з падрыхтоўкай узброенага паустання ў Петраградзе і Маскве.

НОВЫЯ КНІГІ



Работа В. М. Сікорскага «Барацьба большэвікоу начале з В. І. Леніным за чыстату марксісцкай тэорыі у гады рэакцыі (1907—1910 гг.)», выпушчаная нашым выдавецтвам, заслугоувае увагі не толькі таму, што ў ёй закранаюцца важныя і складаныя пытанні ідэалагічнай барацьбы пасля першай рускай рэволюцыі, але і таму, што яна з'явіцца каштоуным дапаможнікам для вывучаючых гісторыю КПСС.

Студэнты ВНУ, слухачы партшкол і вячэрніх універсітэтау марксізма-ленінізма знойдуць у ёй адказы на пытанні, якія «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» або зусім не высвятляу, або высвятляу недастаткова.

У брашуры ўзнаўляюцца яскравыя ленінскія характарыстыкі сутнасці вехаўства ў палітыцы; богабудаўніцтва і богашукальніцтва ў ідэалогіі; дэкадэнцтва у літаратуры і мастацтве; махізма у філасофіі.

У брашуры вельмі ясна падкрэсліваецца, што рэакцыя на ідэалагічным фронце мела ярка выражаныя палітычныя мэты —абліць патокам гразі і паклёпу першую рускую рэволюцыю, рэлігіёзным дурманам затуманіць свядомасць працоўных мас і адцягнуць іх ад барацьбы за соцыяльнае вызваленне, пры дапамозе навукападобных філасофскіх выкрутасау рэвізаваць тэарэтычны фундамент комунізма—дыялектычны і гістарычны матэрыялізм. У рабоце В. М. Сікорскага даволі ўмела абгрунтоуваецца важнасць барацьбы большэвікоў начале з Леніным супраць ідэалагічнай рэакцыі ў гэты перыяд. Аўтар падкрэсліу вялікія заслугі Ваоускага і Горкага ў выкрыцці цемрашалау ад літаратуры і мастацтва, паказаў, што сапраўднае, рэволюцыйнае, жыццесцвярджальнае мастацтва магчыма дзячыся на пазіцыях пераварыць толькі знаходзячыся на пазіцыях радавога рэволюцыйнага класа.

Прачытаўшы брашуру В. М. Сікорскага, чытач зразумее, што як 50 год назад, так і у сучасны момант ідзе жорсткая барацьба паміж новым і аджываючым светам. Гэта барацьба адбываецца як у эканамічнай і палітычнай, так і у ідэалагічнай сферах. Дыпламіраваныя лакеі імперыялізма—соцыёлагі, філосафы, публіцысты паклёпнічаюць на Совецкі Саюз і краіны народнай дэмакратыі, выкарыстоуваючы пры гэтым старую заржавелую зброю вехаўцаў, дэкадэнтаў, махістаў і іншага буржуазнага атрэб'я.

Брашура В. М. Сікорскага прасякнута ваяуніча матэрыялізмам і партыўнасцю ў адносінах да сучаснага цемрашальства буржуазных ідэолагаў.

* * *



У брашуры Ф. В. Баравіка « Пераходны перыяд ад капіталізма да соцыялізма. Перамога соцыялізма у СССР» даецца яскравая марксісцкая аргументацыя неабходнасці цэлага пераходнага перыяду і дыктатуры пролетарыята для перахода ад капіталізма да соцыялізма абагульняецца вопыт будаўніцтва соцыялістычнай эканомікі у СССР.

Падкрэсліваючы рознастайнасць форм пераходу да соцыялізма ў залежнасці ад своеасаблівасці эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця краін, у брашуры тым не менш адзначаецца, што некаторыя асноуныя заканамернасці і рысы развіцця соцыялістычнай рэволюцыі у СССР непазбежны для кожнай краіны, якая стане на шлях соцыялістычнага развіцця. Гэтымі рысамі з'яуляюцца: дыктатура пролетарыята, саюз рабочага класа з сялянствам, кіруючая роля Комуністычнай партыі.

Мэтай брашуры з'яўляецца таксама выяўленне заканамернасцей узнікнення і сцвярджэння соцыялістычнага спосабу вытворчасці. Аўтар умела дае ленінскае абаснаванне соцыялістычнай індустрыялізацыі, якая забяспечвае незалежнасць соцыялістычнай дзяржавы ад капіталістычнага свету і стварае ўмовы для соцыялістычнай рэканструкцыі усёй народнай гаспадаркі і росквіту культуры.

Н. ЛЕЎДАНСКАЯ, С. АНЦІПЕНКА.

На калгасных палях Мінскага раёна

* * *

СПРАЎЛЯЮЦЦА НА ЎСІХ РАБОТАХ

— Адкажыце, калі ласка, дзе тут працуюць студэнты універсітэта?

Дзяўчына, да якой мы звярнуліся, паставіла напоўненыя вадой вёдры на зямлю і запытальна глянула на нас:

— А вы што, таксама студэнты?

— Так, мы студэнты-журналісты.

— Ага,—кіунула наша субяседніца. Задаволіўшы сваю зацікаўленасць, яна схамянулася:

— Пытаецеся, дзе студэнты працуюць?—Усюды—і у полі, і у амбары, і на агародзе, і хмель збіраюць. Толькі зараз там няма нікога—у іх абед...

Аднак аказалася, што многія студэнты выходзяць на працу да заканчэння абедзенага перапынку.

Па дарозе да свірна мы сустрэлі трох дзяўчат. Самая бойкая з іх расказвала нам аб іх сельскім жыцці:

— Тут, у вёсцы Закрушка, размясцілі хімікаў-трэцекурснікаў. Так што мы—хімічкі. Работы выконваем розныя. Напрыклад, збіраем хмель. Яго тут многа. Можа таму і у вёсцы такая выразная назва—Закрушка?

— Вы пытаецеся як мы адпачываем? Як калі. Калі вельмі стомішся—паеш і адразу-ж на бакавую. А так... электрычнасці у вёсцы няма, вечарам не пачытаеш. Затое радыё слухаем. Часта перадаюць лекцыі на сельскагаспадарчыя тэмы, так што мы маем магчымасць стаць «аграномамі» не толькі практыкамі, але і тэарэтыкамі.

— Многа у вёсцы музыкантаў. Пасля работы ходзім на танцы. Так вось і праходзяць дні... Прабачце, але нам трэба у поле.

Мы развіталіся і паехалі да свірнаэ дзе, як нам паведамілі гаварлівыя субяседніцы, працуюць перадавікі іх брыгады Валянцін Базыльчык і Міхаіл Батаеў.

Валянціна мы не засталі: ён паехау за кукурузай. А Міхаіл дапамагау калгаснікам укладваць сілас. Разгаварылися.

— Сам я з сялянскай сям'і. Гаворачы па-базарауску, «яшчэ дзед мой зямлю пахау»,—усміхаецца Міхаіл.—Праца прывычная. У пары з Браніславам, тутэйшым юнаком, засеялі усё азімае жыта і каля 70 гектараў пшаніцы. А у свірне чысцім зерне. Працуе нас там шасцёра. Дзённую норму—9 тон—выконваем ужо да 11 гадзін дня. Асабліва вызначаюцца там Наташа Гардзіевіч, Аня Карась і Лена Карповіч. Сумленныя дзяўчыны і, галоунае,—працавітыя.

Калі мы пад'язджалі да студэнтау-біёлагау з чацвертай орыгады, яны скірдавалі салому.

— Прэса, прэса прыехала! Газеты прывезлі! У час кароткага перапынку студэнты з тэлеграфнай кароткасцю паведамілі «прэсе»:

— Мы ўжо капалі бульбу, вязалі у снапы ячмень, складвалі авёс, ачышчалі катлаван пад бульбу Працуем весела. На днях, напрыклад, раскідвалі навоз; гэты занятак так усім спадабауся, што «біліся» з-за сахор.

— У хаце-чытальні збіраемся па вечарах, танцуем, пяем. Два—тры разы у тыдзень глядзім кіно. Бачылі «Вышыню», «Пуцёўку у жыццё» і «Я сустрэу дзяўчыну». Словам, жывем—не сумуем.

— Перадавікі? Ёсць і такія. Гэта—Рая Ганчарова, Іна Царова, Ліна Раукова. Ну і іншыя, зразумела, не гультаі.

І. РУДАМЁТАЎ.

Будучыя філолагі выбіраюць бульбу так, каб у полі не засталося ніводнага клубня. Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Дружна жывуць студэнты

...У адзін з цёплых сонечных дзён, якія не часта бываюць у верасні, мы пад'язджалі да станцыі Ратамка. Патрэбна было наведаць калгас «Кастрычніцкая рэволюцыя», дзе працуюць студэнты гістарычнага факультэта.

...У прасторным пакоі цёпла і утульна. З расстауленых на сталах талерак клубамі узнімаецца гарачы пар. Паміж сталамі ходзіць дзяўчына у белым халаціку і пытаецца:

— Хто хоча дабаукі?

— Тамара, дай, калі ласка, мне яшчэ,—гаворыць светлавалосы юнак і падае сваю талерку.

Сталовую Ратамскага дзіцячага дома мы наведалі у час абедзеннага перапынку, калі Тамара Барысевіч і Марыя Ламбоцкая, студэнткі III курса гістарычнага факультэта, частавалі сваіх аднакурснікаў смачным абедам.

Думка гатаваць і харчаваццаў гэтай сталовай з'явілася у трэцекурснікаў як толькі яны прыехалі у калгас. Гатуюць страву студэнтам павары з дзіцячага дома. Але асноуную работу тут выконваюць Тамара Барысевіч і Марыя Ламбоцкая. Кожная з іх мае ужо свой вопыт у кулінарыі. Дзяўчаты не баяцца працы, хоць і даводзіцца ім раней за усіх уставаць і позней лажыцца. У калгасе кашавары нездарма карыстаюцца павагай і любоўю. Добра спраўляецца са сваей справай і Клара Краучанка. Яна ведае усімі гаспадарчымі справамі.

— А як працуюць студэнты?

Перш, чым мы самі убачылі, на гэтае пытанне адказаў старшыня калгаса Сямён Захаравіч Блінкоу.

— Добрых памочнікаў прыслау нам універсітэт, мы вельмі удзячны.

У першай брыгадзе, у якую уваходзіць вёска Качына і пасёлак Ратамка, працуюць студэнты I і III курсаў гістфака. Трэцекурснікі у гэты дзень былі на розных работах: дзяўчаты дапамагалі абмалочваць лён, чысціць у свірне збожжа, хлопцы грузілі грэчку і адвозілі яе у Мінск.

Нельга было не залюбавацца працай Галі Кірэевай, Раі Мірончыкавай, Соні Чымбург, Ніны Скроба і Галі Габрынец. Калгас даручыў ім машыну «Эдзі», у рух якую прыводзіць электрычнасць. Дзяўчаты арганізавалі справу так, што машына не прастойвае ні воднай гадзіны. Дабіліся яны гэтага дзякуючы таму, што працуюць у дзве змены.

Трэцекурсніцы за два дні сабралі і звязалі у снапы лён з плошчы звыш 30 гектараў.

Тут-жа побач знаходзіцца свіран. Праз шум машын адтуль даносяцца маладыя галасы, чуваць песня. Гэта Зоя Бялуга, Ніна Ткачэнка, Міхаіл Крыштапау, Аляксандр Валаховіч і Жан Стасенка чысцяць грэчку. Да іх цяжка падыйсці: усё застаулена мяхамі з чыстым збожжам.

Дружна жывуць студэнты. Гэта дапамагае ім весела праводзіць свой вольны ад работы час. Яны арганізавалі вечар адпачынку. А нядауна адзначылі дваццацігоддзе Рэма Лукашэвіча.

Разам з кіраўніком студэнтау гістарычнага факультэта, якія працуюць у калгасе «Кастрычніцкая рэволюцыя», Д. Б. Мельцэрам мы пабывалі і у іншых брыгадах. Усюды калгаснікі з пахвалой адзываліся аб нашых студэнтах. Многа прыемнага мы пачулі аб першакурсніках Уладзіміру Шумчэня, Пятру Арцёменка, студэнтках IV курса Галі Гаурыленка, Ларысе Пракаповіч і многіх другіх.

І. ШУЦІК,
В. МАШКОЎ.

Выдатна працуюць чатырохкурсніцы аддзялення беларускай мовы і літаратуры!

ТАК І ПРАЦУЕМ

Не паспеушы як след пазнаёміцца адзін з другім, мы паехалі у калгас. Наш курс падзялілі на дзве групы. З першага-ж дня мы пачалі убіраць агуркі. Наступныя дні працавалі на уборцы хмелю. Праца не цяжкая, але сказалася наша няумение. Спачатку ніхто не выконваў устаноуленых норм. Але цяпер не толькі выконваем, а нават перавыконваем іх.

Тут, у калгасе, мы добра навучыліся працаваць. Марыя Пупкевіч, Ніла Кунцэвіч, Роза Каждан, Люся Паваразнюк працуюць як бывалыя калгасніцы.

У нас ствараецца моцны студэнцкі калектыу. У вольны час ходзім у хату-чытальню, а там заусёды ёсць новыя часопісы, газеты.

Студэнты I курса хімічнага факультэта.

Рэдакцыі паведамілі: лепш за ўсіх на калгасных палях працуюць ПЕРШАКУРСНІКІ

Добра ведаюць у калгасе імя Жданава студэнтку IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Раісу Станкевіч. Гэта аб ёй пажылы калгаснік Васіль Аляксеевіч Аляксейчык сказаў:

— Пабольш бы да нас прысылалі такіх студэнтак!

НА ЗДЫМКУ: Раіса Станкевіч.

ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ

Першая брыгада калгаса імя Жданава. Тут працуюць студэнткі IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры. Пакуль што галоуная іх работа—вазіць і скірдаваць салому.

— Ну, як спраўляюцца вашы памочніцы?—запыталіся мы у брыгадзіра Нікалая Ануфрыевіча Мірончыка.—Ці задаволены вы імі?

— Няма на што скардзіцца, дзяўчаты баявыя, з такімі хоць на фронт,—адказаў ён. Прауда, спачатку вілы не слухаліся, і работа здавалася вельмі цяжкай. Але паглядзіце, як яны працуюць цяпер. Нават цяжка вылучыць лепшых: усе імкнуцца быць першымі.

І сапрауды, дзяўчаты працуюць добра. Ляціць на скірды салома, і каб весялей было, адусюль ляцяць жарты. Яны не толькі навучыліся добра валодаць вілами. Нават такая работа, якая патрабуе умення і навыкаў, як складанне саломы ў скірды, ладзіцца зусім нядрэнна. Ніна Сярмяжка на гэтай рабоце удастоена асаблівай узнагароды—пахвалы Нікалая Ануфрыевіча. Два вазы саломы прывезена і складзена і даабедзеная норма выканана.

...Адпачынак. Трэба атрымаць прадукты. Дзяўчаты накіроўваюцца да складу. Па дарозе расказваюць нам:

— Пры усім жаданні не можам устанавліваць рэкорды. Работа у калгасе яшчэ не наладжана так, каб прывозілі больш чатырох вазоу саломы у дзень. Вось з заутрашняга дня пачнем капаць бульбу, тады і выявяцца у поуную меру нашы перадавікі.

...У шостай брыгадзе калгаса «Комінтэрн» працуюць хлопцы I курса аддзялення рускай мовы і літаратуры. Памочнікі добрыя, многа карысці прыносяць калгасу. Тыя з іх, якія умеюць касіць, як А. Андрыянчык і Л. Фадзееу, працуюць на сенакосе. Астатнія звозяць авёс, ячмень, працуюць на ільне. Адчуваецца, што хлопцы адносяцца да працы па-гаспадарску. Яны нават не маглі утрымацца, каб не паказаць нам, якую добрую кукурузу будуць хутка убіраць.

Аднак, нажаль, добрае уражанне ад работы гэтай брыгады псуюць В. Алежка і І. Жалега.

— Дзіуныя нейкія людзі,—гавораць аб іх таварышы.—Трымаюцца заусёды асобна, нават імён іх не ведаем. А ад працы дык зусім ухіляюцца. То прыйдуць без віл, то у працоуны час ляжаць або ходзяць невядома дзе.

С. АНЦІПАВА,
Л. ДАНСКАЯ.

РАЗМОВА ГУЛЬТАЁЎ:

І. Жалега: Пойдзем, мабыць, да усіх?

В. Алежка: Навошта? Няужо табе тут дрэнна?

З раніцы студэнты IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры працавалі на малацільным таку калгаса імя Жданова. У другой палове дня брыгадзір падау каманду:

— Застагаваць салому!

Хлопцы энергічна узяліся за справу.

Добра працуюць дзяўчаты на падвозцы саломы.

Гэта Валя Кірылава, Людміла Шалай, Іра Слонімская і іншыя. А Таіса Мішурная і Іна Кананучанка выдатна зарэкамендавалі сябе на скірдаванні. Тут яны нікольки не уступаюць калгаснікам.

У дні студэнцкага лета

ФЕСТЫВАЛЬ У МАГДЭБУРГУ



Фестываль моладзі Магдэбургскай акругі праходзіў з 3 па 11 жніўня. Свята гэтае было арганізавана сіламі Саюза вольнай нямецкай моладзі, самай масавай у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы моладзёжнай арганізацыі. Па яе запрашэнню на фестываль выехала маладзёжная дэлегацыя горада Мінска, у склад якой уваходзілі рабочыя, студэнты, танцавальны калектыў Палаца прафсаюзаў, артысты.

...Раніца. Германія. Наш сусед па вагону — немец—сустракае родную зямлю акуратна абранутым. Ён вельмі узбуджан. Падзывае нас да акна і з задавальненнем паказвае і растлумачвае усе, што сустракаецца на шляху і што нас цікавіць. «Хутка Берлін!»—без канца паутарае наш спадарожнік. Да Берліна пад'ехалі зусім непрыкметна і праз дзве гадзіны ўжо сустрэліся са славутасцямі Усходняга сектара горада. Наш маршрут ляжаў на Магдэбург.

Такой урачыстай і разам з тым цёплай сустрэчы мы нават і не чакалі. Кветкі, сяброўскія усмешкі, маладзёжныя гімны, маршы у выкананні дзіцячага аркестра... Нас прывітаў сакратар райкома. У сваім выступленні ён падкрэсліў значэнне прахо-дзячага фестывалю у справе аб'яднання юнакоў і дзяўчат у барацьбе за мір і дружбу.

У першы-ж дзень нашага знаходжання у Магдэбургу адбылася экскурсія па гораду. Магдэбург — старадаўні нямецкі горад, заснаваны яшчэ у 550 годзе. Гісторыя была бязлітасна да яго: тры разы горад разбураўся і кожны раз узвадзіўся па-новаму. Толькі у цэнтры горада захаваўся сабор, якому ужо болей тысячы год. Гэта велічны будынак з чатырма цудоўнымі шпілямі. У старадаўнім парку «Княжацкая агарожа», які спукаецца да Эльбы ад сабора, гулялі некалі славуты свамі «магдэбургскімі поушар'ямі» Ото Гёрыке, вядомы архітэктар Шнепер.

А побач—лясы новабудоўляў, тут жыве і працуе новы, будуючыйся Магдэбург.

Магдэбург — буйнейшы прамысловы цэнтр ГДР. Прадукцыя машынабудаўнічых заводаў імя К. Лібкнехта і імя Э. Тэльмана складае значную частку прамысловай вытворчасці рэспублікі.

Нямецкія сябры акружылі нас выключнай увагай і клопатамі. Нам была прадастаўлена магчымасць наведаць рад прадпрыемстваў, мы сустракаліся з маладымі рабочымі, студэнтамі. Тэатры, выстаукі, экскурсіі дапамаглі нам атрымаць некаторае уяўленне аб культурым жыцці нямецкай моладзі.

З усіх шматлікіх сустрэч з моладдзю, бадай, самай памятнай была сустрэча з удзельнікамі фестывалю у палатачным лагеры, які размясціўся на беразе Эльбы. Фестываль злучыу тут юных немцаў Усходу і Захаду, дэлегатаў і гасцей у адзіную дружную сям'ю. У святочныя дні тут спаборнічалі юныя тэхнікі і стралкі, праводзіліся спартыуныя спаборніцтвы, выступалі лепшыя маладзёжныя калектывы мастацкай самадзейнасці.

Мы пазнаёмілся з двума нямецкімі сябрамі. Першы—Іоахім Гідеман, асістэнт настаўніка, другі—Вольфганг Каус, адзін з кіраўнікоў мясцовай маладзёжнай арганізацыі Заходняй Германіі. Іоахім добра валодае рускай мовай. Ён гаворыць нам, што яго сябра вельмі жадае сказаць некалькі слоў і перавадзіць: Вольфганг рад, што мае магчымасць перадаць праз нас шчырае сардэчнае прывітанне баявому комсамолу Совецкага Саюза ад перадавой моладзі Заходняй Германіі. «Ад імя маладых патрыётаў я зацвярджаю: вы яшчэ пабачыце, што мы можам змагацца за мір, за дружбу, за адзінства! Прауда, зараз нам вельмі цяжка. Тэрор... Каля 500 актыуных членаў маладзёжнага саюза сядзяць у казематах, але мы не складаем рукі. Мы добра ведаем—шчасце патрабуе ахвяр. Як гавораць рускія, будзе і на нашай вуліцы свята!»

Цудоуна мы правялі гэты цёплы жнівеньскі дзень, сустрэлі многа сапраудных сяброу. Радасць, смех, вяселле... Не, яны не жадаюць вайны! І як-бы у пацверджанне гэтай думкі, дружна скандуюць маладыя галасы: «Мір, дружба!»

Незабыунымі застануцца цёплыя сустрэчы, канцэрты, конкурсы мастацкай самадзейнасці, урачысты парад і цудоуны феерверк у гонар фестывалю.

Нам пашчаслівілася прысутнічаць на урачыстасцях у час знаходжання у Магдэбургу совецкай Партыйна-урадавай дэлегацыі начале з Н. С. Хрушчовым. Сустрэча вылілася у хвалюючую дэманстрацыю дружбы совецкага і германскага народаў.

Г. ГАЛКОЎСКАЯ,
студэнтка IV курса біялагічнага факультэта.

Універсітэцкія будні

(Заканчэнне. Пачатак на I стар.)

НА СПАРТЫЎНЫХ СНАРАДАХ

У спортзале займаюцца гімнасты. Дужыя, мускулістыя хлопцы лёгка працуюць на спартыуных снарадах. Трэнер Р. І. Рэцкі часам робіць заувагі, дае парады. Вось да бруссяу падыходзіць студэнт III курса фізіка-матэматычнага факультэта Грыгорый Рэзнікаў. Некалькі імклівых рухаў—і ён у паветры. Пярэдняе сальта у саскок зроблена выдатна. Не горш выконвае ён па кольцах і адно з складнейшых пракванняу—крыж. Грыгорый займаецца гімнастыкай тры гады. Цяпер ён працуе на праграме першага разраду.

Па першаму разраду займаецца і студэнт IV курса аддзялення матэматыкі Рэніс Лісneускі. На здымку вы бачыце, як Рэніс выконвае стойку на кольцах.

Гімнасты заканчваюць заняткі. Спортзал займаюць лёгкаатлеты. Яны таксама рыхтуюцца да новых спаборніцтваў. Бліжэйшым будзе сустрэча са спартыуным калектывам Вільнюскага універсітэта.

ПАСЛЯ ЗАНЯТКАЎ

Заусёды прыемна зайсці ў пакой, прыбраны пяшчотнымі дзявочымі рукамі. У інтэрнаце па вуліцы Свярдлова нямала такіх пакояу. У адным з іх—49-м—жывуць студэнткі хімічнага факультэта. Дзяучаты зрабілі свой пакой утульным і прыгожым.

Мы заснялі той момант, калі стараста пакоя Ала Казанцава падвешвала на сцяну апошнюю рамку з вышыукай. Каб часам не адбылося памылкі, яе працу карэкціруе Юля Гарнастаева. Вось так будзе добра! Цяпер у пакоі наведзены поуны парадак і кожны можа з задавальненнем праводзіць вечар: хочаш—чытай, хочаш—ідзі у кіно, або пагутары з сяброўкамі, нават паспрачайся, калі гэта трэба для справы, бо як гаворыцца, ісціна нараджаецца у спрэчцы. Аднак лепш за усё запрасіць сябровак другога пакоя і паслухаць некалькі любімых пласцінак.

На здымку: Рэніс Лісneускі выконвае стойку на кольцах.

Тэкст О. СЦЕПАНЕНКА,
Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

Ала Казанцава ўпрыгожвае пакой.

Прыемна паслухаць любімыя песні.

Калі сяброукі пачулі аб заклiку ЦК ВЛКСМ, то аднадушна рашылі дапамагчы убраць цалінны ураджай. Праз некалькі дзён, узмужнелыя і шчаслівыя, яны вярнуцца з цаліны і прыступяць да заняткаў.

Адзінай дружнай сям'ёй жывуць нашы студэнты.

Добра ведаюць і паважаюць на фізіка-матэматычным факультэце узбечку Нэлу Хаджаеву. Добры, чулы таварыш і сябра, актыуны удзельнік мастацкай самадзейнасці, выдатны спартсмен—такая агульная думка аднакурснікаў аб ёй. Нэла—член зборнай каманды універсітэта па гімнастыцы. Сваёй, роднай лічаць яе на курсе. Н. Хаджаева, В. Чэпцова і С. Зэйдэнкноп неразлучны.

У нашым універсітэце вучацца людзі розных нацыянальнасцеи. Усіх іх аб'едноувае шчырая дружба. Яны разам ходзяць на лекцыі, у кіно і тэатры, спяваюць адны песні, дзеляцца сваімі планамі на будучае, дапамагаюць адзін другому у вучобе.

Студэнты з Польскай Народнай Рэспублікі адчуваюць сябе ва універсітэце, як у роднай сям'і. М. Мукасей і Л. Філіпік разам закончылі Беластоцкі педагагічны ліцэй, разам прыехалі вучыцца у БДУ на філалагічны факультэт. Жывуць яны у адным пакоі з двума дзяучынамі з Беларусі.

— Жывем мы вельмі дружна, рашылі не змяняць склад пакоя да заканчэння універсітэта,—у адзін голас заяуляюць Люба Філіпік, Надзея Мукасей, Зінаіда Кардаш і Надзея Гурын.

Часта студэнты з Польшчы бываюць у сярэдніх школах. Яны расказваюць вучням аб сваёй краіне, аб жыцці моладзі у ей. Многія з іх пабывалі у падшэфным калгасе «Комінтэрн», на заводах—трактарным, аутамабільным, мотавеласпедным і радыё. Разам з другімі студэнтамі яны былі на сустрэчах з рабочай моладдзю горада Мінска.

— Мы любім свой курс, сваю будучую прафесію, мы адчуваем сябе, як на Радзіме,—гаворыць Люба Філіпік.

А хто не ведае ва універсітэце студэнта IV курса гістарычнага факультэта паляка Стэфана Сцепанюка. З першага-ж курса ён актыуна ўключыуся у спартыунае жыццё універсітэта. Стэфан—член зборнай каманды БДУ па лёгкай атлетыцы, мае II разрад па бегу. Жыве ён са сваімі братамі-беларусамі.

— Я ніколі не забуду іх сяброускай дапамогі,—гаворыць Стэфан.—Яны для мяне сталі роднымі, блізкімі, дарагімі людзьмі. Астаушыеся два гады ва універсітэце я буду жыць з імі. Думаю, што дружба захаваецца на усё жыццё.

Абавязкова захаваецца!

Дзе-б нашы студэнты ні былі, дзе-б ні працавалі, дзе-б ні адпачывалі, яны выказваюць пастаяннае імкненне да дружбы, да таварыства, да калектывізма, выхоуваюць гэтыя якасці у малодшых сваіх таварышоу.

І. СТАРАВОЙТАЎ.

ДРУЖБА

— Ну як, Галя?—кінуліся сяброукі-беларускі да прыгажуні-украінкі Галі Матвейчук, якая толькі што выйшла з аудыторыі ад экзаменатара.

— Выдатна...

— Галя, даражэнькая, я рада за цябе,—ласкава кажа Джэма Трухан.

Студэнткі хвалявaліся за Галю, цяпер яна сама стаіць ля дзвярэй і таксама хвалюецца за сваіх сябровак.

З першага курса завязалася шчырае сяброуства паміж дзяучатамі цяперашняга III курса аддзялення рускай мовы і літаратуры. Адзін другому дапамагаюць, выручаюць у крытычныя моманты. Галі падабаецца беларуская мова, і яна рашыла хутчэй яе дасканальна вывучыць. Сяброукі прыйшлі на дапамогу. І ужо праз год яна змагла ужываць у пісьмах да сваіх бацькоў найбольш трапныя беларускія словы і прыказкі.

Ва універсітэце ідзе падпіска на перыядычны друк.

На здымку: Падпісваюцца журналісты 3-га курса.

У рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт»

З пачуццём глыбокай удзячнасці сардэчна дзякуем усіх выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта, якія выказалі шчырае спачуванне з выпадку нашага бязмернага гора —заучаснай трагічнай смерці нашага горача любімага сына Валодзі.

Бацькі В. АЎСЕНЕВА.

Рэдактар А. ВОЛК

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01626 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1023 Тыраж 2000